**Сяргей Чыгрын**

# Камень Міндоўга

***Вершы***

**Мінск**
**“Кнігазбор”**
**2009**

**Сяргей Чыгрын**
**Камень Міндоўга. Вершы**

У паэтычны зборнік беларускага паэта Сяргея Чыгрына ўвайшлі вершы пра самае светлае і дарагое — Бацькаўшчыну і каханне.

Усё, пра што піша Сяргей Чыгрын, дарагое і майму сэрцу: і касцёл святога Андрэя ў Слоніме, і духоўны подзвіг Міхала Валовіча, і спадчына Гальяша Леўчыка, і, вядома ж, усё, што звязана з Навагрaдчынай – даўні замак і сцежкі Адама Міцкевіча, камень Міндоўга... Сфера інтарэсаў аўтара найперш духоўныя здабыткі народа, які зведаў неймаверны цяжар няволі і нядолі, але “ні перад кім ... не сагнуўся.” Важнае і тое, што патрыятычная і светлая паэзія Сяргея Чыгрына непарыўна звязаная з яго актыўнай грамадзянскай пазіцыяй і рэальнымі справамі па замацаванню нашай спадчыны. Сваім талентам пісьменніка, краязнаўца і журналіста ён аддана служыць Беларусі, і ягоная паэтычная кніга – чарговае таму пацверджанне. Добрага ёй шляху!

***Вольга Іпатава***

# Родныя словы

***П.У.Сцяцко***

Кажыце *сваяцтва*, а не радство,
Кажыце *краса, пекната, хараство*,
І *дабрыня, бальшыня, меншыня* —
Кажыце, пакуль вам падказваю я.
*Адметны* кажыце і *адмысловы* —
Такія прыгожыя родныя словы.
Кажыце *круцёлка*, а не вяртушка,
*Нясуха* па-нашаму, а не нясушка,
Кажыце *ваяка, жаўнер і ваяр*,
*Ялінка, ядловец* і *юшка*, і *яр*.
*Малы* і *малеча*, а не малыш,
І вельмі прыгожае слова *спаміж*.
Забудзьце ляднік, а ёсць наша — *лядоўня*,
*Трайняты* кажыце заўжды, а не тройня.
*Крумкач* ці *груган*, ды толькі не воран
Кажыце, калі ён лятае над борам.
Ёсць *плата*, вядома, а не плацеж.
Ды *куфлям* піва суседа пацеж.
Пасля пачастуй *баханкаю* хлеба,
А не буханкаю — гэтак не трэба.
Кажыце, што ў *збан* малако наліваецца,
Але не жбан ці жбанок падстаўляецца.
Не загавор вы кажыце, а *змова* —
На словы багатая родная мова.
Ёсць слова *наросхрыст* — не нараспашку,
*Сарочку* сваю апрануць — не рубашку,
Ёсць слова *паспешлівы* — ды не таропкі,

Нялёгка прайсці праз горы і сопкі.
Ёсць слова *таннець* — не дзешавець...
Нам блізкія словы лягчэй зразумець.
На іх і трымаецца родная мова –
Таму беражыце яе кожнае слова!

## Камень

Паеду ў Наваградак,
Каб спатыкнуцца
Аб камень Міндоўга,
Аб які спатыкнуўся
Адам Міцкевіч.

## Малітва

Разам з народам сваім застануся —
Гору дамо мы рады,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да ПРАЎДЫ!

Ні перад кім мой народ не сагнуўся —
Зведаў цяжар нядолі,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да ВОЛІ!

Разам з народам не адступлюся —
Тут крывічоў пакаленне,
Дайце дарогу маёй Беларусі

Да АДРАДЖЭННЯ!

Богу за ўсё на зямлі пакланюся
І папрашу міласэрнасці,
Дайце дарогу маёй Беларусі
Да НЕЗАЛЕЖНАСЦІ!

***

Я выйшаў родам з гэтага народа,
Я мову гэту ў сэрцы берагу…
О, Беларусь! — спагада і свабода,
Я без цябе і дыхаць не змагу!

## Мова

Мова мая з-пад сахі,
Мова мая з-пад страхі,
Ластаўкай лёгкай лунае —
Мне не патрэбна чужая.

Мова мая з-пад касы,
Мова мая са слязы,
Яркім бурштынам ззяе —
Мне не патрэбна чужая.

Выткана мова на кроснах
І разаслана па вёснах,
У горы і шчасці зблiжае —

Мне не патрэбна чужая.

Кожнае сэрца і хата
Роднаю мовай багаты.
Вечная і святая...
Мне не патрэбна чужая.

*******

Наваградскі кліча рог —
Збірае ліцвінаў на веча.
З дружанай спяшае Міндоўг
Ў Наваградак на сустрэчу.

Трымайся, маскаль Галіцкі, —
Наш князе збірае войска...
Мы пачынаемся ўсе
З Вялікага Княства Літоўскага.

***

Мая залатая восень,
Нібы карона Міндоўга.
А я пакуль шчэ ў дарозе —
Хай будзе шчаслівай дарога.

І роўнай хай будзе, і вузкай,
І цяжкай няхай у нагрузку...
Абы на зямлі беларускай
Мне думаць па-беларуску!

## Міхал Валовіч

*Памяці кіраўніка*
*паўстання 1831 года на Беларусі*

Мураўёвы цябе не зловяць —
Ты ў нашых сэрцах жывеш,
Вялікі Міхал Валовіч,
Як мова, як песня, як верш.

І ніхто нас ніколі не зломіць,
І мы не скарымся ім.
Ты з намі, Міхал Валовіч,
Як Айчына, як сцяг, як гімн!

## Касцёл святога Андрэя ў Слоніме

Да крыніцы святой прыпаду,
Бо душа моцна смагай хварэе.
Па слядах Льва Сапегі пайду
Да касцёла святога Андрэя.

І ступлю на цвінтар распісны,
Што, як сонца, з гадамі старэе.
Знікне чорны куфэрак маны
Ля касцёла святога Андрэя.

Знікнуць боль і адчай, і трывога,
І душа, як вясна, развіднее...

Папрашу я свабоды у Бога
У касцёле святога Андрэя.

## Паэт

***Паэт — гэта той, хто піша вершы,***
***І той, хто вершаў не піша.***
*Тадэвуш Ружэвіч*

Паэт — гэта той, хто сяброў сустракае,
І той, хто не мае ніякіх сяброў.
Паэт — гэта той, хто дамоў прыязджае,
І той, хто не можа прыехаць дамоў.
Паэт — гэта той, хто жанчыну кахае,
І той, хто не ўмее жанчыну кахаць.
Паэт — гэта той, хто заўжды памірае,
І той, хто не можа ніколі сканаць.
Паэт — гэта той, хто крадзе і махлюе,
І той, хто нічога ніколі не краў.
Паэт — гэта той, хто заўсёды ваюе,
І той, хто мяча у руках не трымаў.
Паэт — гэта той, хто сабой ганарыцца,
І той, хто трывае пагарду людзей.
Паэт — гэта той, хто вайны не баіцца,
І той, хто на бітву са страхам ідзе.
Паэт — гэта той, хто віно выпівае,
І той, хто не можа выпіць да дна.
Паэт — гэта той, хто вясну сустракае,
І той, каму толькі сніцца вясна.
Паэт — гэта той, каго ўсе ненавідзяць,
І той, каго любяць, як Бога, усе.

Паэт — гэта той, каго нельга пакрыўдзіць,
І той, хто ўсе крыўды ў сабе нясе.
Паэт — гэта той, хто заўсёды чакае,
І разгадае жыццёвы сакрэт...
Паэт — гэта той, хто Айчыну кахае!..
Паэт — гэта той, хто ПАЭТ!

## Мая мова

Не змаўкай, мая мова, не змаўкай,
І не гніся ты кволенькім дрэўцам.
Не скарылася век чужакам —
Таму смела гняздзіся ў сэрцы.
Ты квітней, мая мова, квітней
Васільком радаводным у жыце.
Дзень будзённы з табою святлей
І званчэй птушак песні ў зеніце.
Ты жыві, мая мова, жыві,
Як вясновая квецень, як неба...
Ап'яні,
абудзі,
астудзі,
абнаві —
Ад чужой такой ласкі не трэба!

## Гальяш Леўчык

Дамоў
Зычлівы Слонім клікаў,
Дзе сэрцу ўсё так блізка,
Дзе, як струна са скрыпкі, —
Канал Агінскага.

## Успенскі сабор у Жыровічах

Я слаўлю тваю старажытнасць
На слаўнай крывіцкай зямлі,
Дзе ў сонцы купаецца жыта
І ў вёсках рыпяць жураўлі.

Дзе мова гучыць беларуская,
Ад кветак святлеюць бары,
Дзе кожная сцежка вузкая
Расою блішчыць на зары.

Дзе звычай жыве спрадвечны —
Вяселлі спраўляць гучней...
Дзе ты так падобны на вечнасць
Сярод землякоў і гасцей.

***

Купляюць Джэка Лондана,
Стаяць у чарзе па Мапасана,
Гюго, Вальтэра, Дзікенса...
Запаўняюць кніжную паліцу
Творамі Маруа, Флабэра, Твена...
А я кожны дзень перачытваю Купалу —
Я пачынаюся з Купалы.

***

У Вязынцы светлай і блізкай
Ля траў і крыніц замру...
З песень Янкі Купалы
Саткана мая Беларусь!

## “Лён” Анатоля Сыса

Ты сабраў гэты “Лён” і выткаў,
З ім хадзіць нам усім па жыцці.
Ты, як сноп льняны, з воза выпаў, —
Мы не можам цябе знайсці.

# Перачытваючы “У палескай глушы” Якуба Коласа

Сумна нам, панна Ядвіся,
У беларускай глушы.
З Палесся да нас вярніся
І зачаруй у цішы.
Згадай нам, панна Ядвіся,
Тыя палескія дні.
За Беларусь памаліся —
Тут нашы з табой карані.
Тут ў школу з сябрамі хадзілі,
Зязюлі лічылі гады…
І грушка, што разам садзілі,
Расце і дае плады…

# Таўры

І для іх тут рамонкі цвілі.
І на іх тут дажджы ліліся…
Гэта таўры пайшлі з Зямлі,
Каб мы замест іх засталіся.

## Пытанне да Кузьмы Чорнага

Кузьма Чорны пісаў “Зямлю”,
І Бушмар яму сніўся начамі...
Песняра я чытаць люблю
Беларускімі вечарамі.
Час для трэцяга пакалення
Наступіў ўжо даўным даўно.
Толькі будучыні прасвятлення
На вялікі жаль не відно.
Толькі лес скіп’ёўскі шуміць,
І вясна за зімой наступае...
Як далей беларусам жыць,
Калі Бацькаўшчына чужая?..

## Фальварак

У знаёмы фальварак
Я прыеду з паненкай.
Колькі выпіта чараў
Сярод траў гэтых, кветак.
Тут мазуркі гучалі,
Салаўі ля сцяжынак.
Танцаваць запрашалі
Мы паненак-ліцвінак.
Сыракомля тут быў,
І Міцкевіч з Марыляй...
Той, хто край свой любіў
Самы светлы і мілы.
І шчаслівыя разам

Выбягалі на ганак…
Мы забылі паненак —
Не забылі фальварак.

## Эмілія Плятэр

Ты нашу Айчыну заўжды
І маю ратавала хату.
Я шукаю твае сляды,
Ваяр наш — Эмілія Плятэр…

А ці ў вольнай дзяржаве жывем
Сярод бедных мы і багатых?..
А ці тою дарогай ідзем
Да цябе мы, Эмілія Плятэр?..

## Велікодная субота

Да Вялікадня пабеляць каміны,
Напякуць у печы пірагоў,
Ад якіх святлеюць нашы сны
І шчырэюць позіркі сяброў.

Да Вялікадня памыюць ручнікі,
Стол засцеляць беленькім абрусам…
Заўтра не працуюць мужыкі —
Заўтра будзе свята ў беларусаў.

## 1938 год

Пастукалі ў дзверы хаты:
— Хто там?
— НКВД! Адчыняй!..
Забралі раніцай тату —
Ад стрэлаў — спалохаўся гай.
Асіны дрыжалі і клёны,
Дубы жалудамі плакалі…
— Адчыняй! – крычалі шалёна,
У шыбы білі прыкладамі.
І ў новых стралялі ахвяраў…
— За што? — шумелі бярозы…
Ды кулі знішчалі іх мары
І крыжавалі лёсы.

***

Мне па начах мая Рагнеда сніцца,
Старыя Вільня, Полацк і Заслаўль.
Таму мне на радзіме добра спіцца,
І светлых сноў губляць заўсёды жаль.
То Вітаўт ў сны загляне, то Скарына,
То Еўфрасіння, то Багрым…
Мне асвятляе сны мая Айчына,
Каб я ніколі тут не быў чужым.

## Калі...

Калі Полацак ёсць,
Еўфрасіння —
Не загіне наш край,
Не загіне.
Калі ёсць Наваградак
І Крэва —
Значыць, нас не зламаюць,
Як дрэва.
Бо Нясвіж ёсць,
І Белая вежа...
Значыць мы
Беларусі належам!

## ***

О, Беларусь — святая каралева,
Дзе золатам блішчыць здалёк Пагоня...
Наш Вітаўт ўцёк з вязьніцы Крэва,
Чужынцы ж гоняцца за ім і сёння.

## Згадка пра 1794 год

Зацвілі і сёлета ружы
На полі былога бою...
Успамін пра мужа —
Каса пад страхою.

# Памяці паэта Сяргея Дарожнага

Сяргей Дарожны.
Жыццё — дарога
У васільковым рассыпу.
А на душы — трывога,
І васількі
У росах тут.
Бывай, мой Слонім!
Сто дарог
Сюды прыводзяць,
І сто трывог,
І сто трывог
За мною ходзяць.
Бывай, мой Слонім!
Буду жыць
Тваёй надзеяй,
Хоць я старэю,
А душа
Зноў маладзее.
Бывай, мой Слонім1
Я з дарог
Яшчэ вярнуся,
І што збярог,
Я давязу
Да Беларусі.
Я давязу
Да Беларусі
Сны землякоў,
Бо сняцца гусі
Над Белай Руссю,

Спеў жаўрукоў.
Бо сніцца Шчара
І канал
Канал Агінскага.
Дзяўчына-мара
Там жыве
І людзі блізкія...
Бывай, мой Слонім,
Мой самы лепшы!..
Я на спатканне
Да цябе
Пашлю з дарогі
Вершы.

## У хаце Ларысы Геніюш у Зэльве

Наведаў хатку, хоць і позна —
Няма славутае паэткі.
Замест гарбаткі, слоў і кроснаў —
Тут толькі кнігі, толькі кветкі.

І абразы нібыта плачуць,
А мне ад горычы здаецца:
Ці ў цэркаўка пайшла, няйначай,
Ці затрымалася у сенцах.

І спудзіць цішыню баюся,
І не хапае гучных слоў.
Паэтка роднай Беларусі
Тварыла моваю дзядоў.

Жыла ў хатцы светлай, чыстай,
Цярпець умела і чакаць.
Хвартух адзеўшы свой квяцісты,
Гасцей любіла сустракаць…

Адкуль былі натхнення, сіла
І сэрца поўнае турбот?..
Відаць, за нас мацней любіла
Яна свой край і свой народ.

## Божа наш ідзе Беларусь

***На Беларусі Бог жыве…***
***Хрыстос прызямліўся ў Гародні…***
*Уладзімір Караткевіч*

Божа наш ідзе на Беларусь,
Каб пачуць Купалу і Скарыну.
Мой народ рахманы прыгарнуць,
Абагрэць яго, каб не загінуў.
Ён ступіў адзін на курганы,
На крутыя сцежачкі, як змейкі.
Дзе з далёкай, мудрай даўніны,
Плачуць ў хатах сумныя жалейкі.
Можа гэта шчэ не Беларусь,
А зусім далёкая краіна?..
Божа, дакажы, што Беларусь
Для майго народа не чужына.
Хай шчаслівым будзе мой народ,

І не дай ты Бацькаўшчыне згінуць…
Божа наш прыйшоў на Беларусь,
Каб пачуць Купалу і Скарыну.

## Каханы край мой

Мой край адзіны, край каханы,
Я без цябе, як студня без вады.
Наступіць час, і мы загоім раны
І больш не пусцім чужакоў сюды.
Чужым няхай чужое застаецца,
А наша мудрасць будзе нам свяціць.
Каханы край мой — васількамі ў сэрцы,
І зубрам белавежскім у жыцці.
Адзіны мой, спрадвечны і спакойны,
Скарыны край, Драздовіча, Купалы…
Імперскія рэпрэсіі і войны
Квітнець табе ніколі не давалі.
Ды прыйдзе час, за гэта я малюся,
Слязою шчасце блісне у вачах,
І дойдзем да сваёй мы Беларусі
Па пакручастых, звілістых шляхах…
Мой край адзіны, край каханы,
Я па-сыноўскі прагну суцяшэння.
Будзь незалежным,
велічным,
з’яднаным
Дзеля наступных нашых пакаленняў.

## Помнік Максіму Багдановічу ў Мінску

Планета зор — высокая планета,
І Млечны шлях — як слуцкі паясок.
Ідзём да помніка вялікага паэта,
І з васількоў нясём яму вянок.

А ён стаіць сур'ёзны і тужлівы,
Нібы чытае першы свой "Вянок"...
Ён вечны, бессмяротны, як радзіма,
Як радаводны ў жыце васілёк!

## Васілю Быкаву

Вайна — гэта знак бяды,
Яе немагчыма забыць.
А мёртвым не трэба вады,
А мёртвым ужо не баліць.

Праз порах і дым вайны,
Праз пасткі
                    і праз вышыні
Ішлі батальёна сыны
І воўчую зграю крушылі.

Абеліскі вітаюць зару,
Жураўліныя крыкі ачнуцца...
Праз Альпы у Беларусь
Пайсці, дажыць і вярнуцца.

# Тэатр у Слоніме

***Памяці заснавальніка Слонімскага беларускага драматычнага тэатра Мікалая Варвашэвіча***

Слаўны шлях наш Агінскі пачаў.
І калі мы заснем у палоне —
Стане пуста ў душы,
Стане цёмна ў вачах,
І не ўспомняцца сцэна і Слонім.
І па Опернай вуліцы мы не прайдзем,
І тэатр не адчыніць нам дзверы.
Цёмным будзе наш цень,
Сумным будзе наш дзень,
І ніхто не убачыць прэм'еры.
Ды не слухайце тых, хто ад злосці крычыць,
Хто закідвае ношы на плечы нам...
Жыў, жыве, будзе жыць,
А мы будзем любіць
Беларускі тэатр Варвашэвіча.

# Змагарам за Беларусь

Жыццё — сланечнік,
Гады — зярняты,
А іх жыццё
Забралі краты.
Жыве сланечнік —
Не ўсе зярняты...

А сонца свеціць —
Баяцца каты.

## Парыж

А ў Навасёлках — ціш,
Ёсць бульба і барыш.
І што нам той Парыж?..
За вокнамі — скавыш,
Крыху кульнеш — маўчыш,
У печку кінеш дроў,
Няма тваіх сяброў…
Ёсць бульба і барыш —
Прыедзь і паглядзіш.
А ў Навасёлках — ціш:
І ўчора, і цяпер…
У нас тут свой Парыж,
А дзед Ігнат — Вальтэр.

## ***

Непрыкметная і пяшчотная,
Незалежная і свабодная,
Паслухмяная і спрадвечная,
І шчымлівая, і сардэчная.
Сарамлівая і лагодная,
Вельмі мілая, высакародная,
Таямнічая, непакорная,
І багатая, і свавольная.

І адважная, і каханая,
Асцярожная і старанная,
Трохі простая, але модная,
Дружалюбная і вясёлая.
Дагаджальная і шчымлівая,
Ураджайная і маўклівая,
І ўпартая, і звычайная,
І ўпэўненая, і адчайная,
І гасцінная, і набожная,
Незвычайная і заможная
Мая БЕЛАРУСЬ!

## Сынковічы

1.
Вёска Сынковічы —
вёска дачок і сыноў,
Як хлеб на зямлі — святая.
Песняю песняў і звонам званоў
З гісторыі выплывае.

Вёска Сынковічы — вёска спатканняў,
Помніць паходы і веча...
Нашых прадзедаў казанне
Царквою ўвекавечана.

2.
Засталася ў спадчыну нам
Не крэпасць ў Сынковічах — храм.
А крэпасць — стагоддзі змылі,

Каб мы не былі чужымі.

Каб мы маліліся ў храме,
Да Бога шукалі шляхі.
Каб Бог быў заўсёды з намі
І нам дараваў грахі.

***

Думаў вершы Алесь Пісьмянкоў,
Ды якія надумаў вершы!
Калі еду ў яго Магілёў —
“Белы Камень” успомніцца першы.

Самы белы згадаецца снег,
Сум агорне па беламу полю...
І чаму гэта ў той старане
У паэтаў самотная доля?..

## Перыферыя?

Якія тут сосны! Якія дубы!
Якія маліны! Якія грыбы!
Якія тут студні з гаючай вадой!
І на лугах у расе травастой!
Якія тут вербы каля ракі!
Якія двухжыльная ў нас мужыкі!
Якія плячыстыя дзевы Марыі...
А вы мне ўсё кажаце, перыферыя...

## Маленства

Чужыя косяць сенажаць
Тваю і нашу,
Давай не будзем сумаваць
Пра дзень ўчарашні.
Чужыя косяць сенажаць,
Ды шмат някошанай...
Давай не будзем сумаваць
Пра найхарошшае.

## Зорка

Зорны сустрэне віхор,
Вецер спаткае золкі.
Я палячу да зор,
Каб адшукаць тваю зорку.

І пакладу на далонь,
Хай яна тут застаецца...
Зорка — святы агонь,
Будзе лячыць маё сэрца.

## Актава

Каляды. Купалле. Каліна.
Калоссе. Каханне. Каміла.
Княства. Кларнет. Кавярня.
Купала. Куфар. Кнігарня.

Камень. Калодзеж. Крыніца.
Касьба. Кветка. Кісліца.
Клунак. Клопат. Карэц.
Крыўда. Клямка. Канец.

## Шчара

Бессаромная Шчара
Зарасла
Чаротам і асакою.
Шчырая Шчара
Працякае праз Слонім
І праз
Маё сэрца.

## Пчолка

Не кусай мяне, пчолка,
Не кусай, не кусай.
Мне і так сёння золка,
А на сэрцы — адчай.
Не кусай мяне, пчолка,
Беражы хабаток.
Ты умееш так лоўка
Назапашваць мядок.
Хай пчаліная матка
Вулей твой беражэ.
Бо і ў нас тут не гладка,
А магчыма — цяжэй.

Не кусай мяне, пчолка, —
Хоць ад болю змаўчу:
Ты ў мой сад — візітоўка,
Цябе бачыць хачу.
І пачуць цябе зноўку,
І адчуць асалоду…
Не кусай мяне, пчолка, —
Пачастуй лепей мёдам.

## Вербніца

Заўтра будзе Вербніца,
І вясна зноў вернецца,
І — Вялікдзень багаты,
І — вярба каля хаты.

Заўтра будзе Вербніца,
Хлопец не ажэніцца,
Пакуль пост не скончыцца —
Пацярпі, хоць хочацца.

Заўтра будзе Вербніца,
Ў шчасце людзям верыцца…
Дык хай б’е нас вярба,
Б’е, каб знікла журба.

# Студня

З гэтай студні
    ўся вёска піла ваду,
Яна боскую сілу
    вяскоўцам давала.
Я да студні з вядром
    сёння ў госці іду,
Каб ў дарозе душа мая
    не высыхала.

# Трыялет

Чыстая, вясёлая вада
З красавіцкім сонейка у згодзе,
Па балоце першы бусел ходзіць —
Чыстая, вясёлая вада.
Будзе шчасце, кажуць у народзе, —
Буслу кола пакладзі на дах...
Чыстая, вясёлая вада
З красавіцкім сонейка у згодзе.

# Хлеб

Мая мама хлеб на стол кладзе,
Адрэзаў я з бохана скібу.
Здалося, што бохан гудзе
Авеяўшы пахам сядзібу.

А можа ў ім звон не астыў,
Што сейбіту здаўна вядомы,
Звон буйных зярнят залатых,
Раскаты вясновага грому?

А можа той спеў жаўрука,
І трактараў рокат, камбайнаў,
Паклала матулі рука
На стол асцярожна і дбайна?..

***

Паеду ў вёску
Дадому —
Там
Пачалося жніво,
І возяць салому.
Там
Высока на возе,
Бацька бачыць
За Шчараю —
Восень.

***

Крочу ў восень
Ціха, асцярожна.
Вецер лісце
Жоўтае скубе.

Скача дождж
Па голай, колкай пожні,
Як па прызбе
Шэры верабей.

***

Неба казыча гром,
Град засыпае ганак.
Ясень дрыжыць пад дажджом,
Слухае сварку маланак.

## Першы снег

У цябе ёсць мара — першы снег,
Першы снег — збылася твая мара.
Хай нясе, як памяць ў белы свет,
Снежную маўклівасць наша Шчара.
Першы снег – як першы пацалунак,
Што растаў слязінкамі з вачэй.
Першы снег — твой лепшы падарунак,
Што растаў слязінкамі з вачэй.
Я даўно пра гэта і не мару:
Першыя снягі мае прайшлі.
Лёгка топчам першы снег ля Шчары,
Дзе вядомыя Агінскія жылі.
І здалося: выйшаў нам насустрач
Слаўны гетман — слонімскі староста.
Патаптаць сняжок, відаць, не супраць,

Ці зіме парадавацца проста…
Першы снег — і памяць, і надзея,
Дзеля іх і хочацца нам жыць.
Ты цяпер чароўна разумееш,
Чаму доўга снег той не ляжыць.
Яго стопчуць людзі і машыны,
Ды праз год ён вернецца ізноў.
Першы снег — пяшчотны і адзіны,
Будзе клікаць на Куццю сяброў.
І сябры прыйдуць… ды знікне снег,
Адплыве у лета твая мара…
Хай нясе, як памяць ў белы свет,
Снежную маўклівасць наша Шчара.

## Манашка

Ты пакліч мяне, манашка,
На пустэльным цвінтары.
Я прыйду, як стане цяжка,
За святарныя муры.
Ты мяне схавай у келлі
І налі віна “Кагор”,
Каб душы дзве затрымцелі
І — per aspera — да зор.
Свечкі полымя патухне,
Мы з табою памаўчым.
І нас храм дваіх прытуліць,
Як паломнікаў ўначы.
А пад раніцу званіца
Нас разбудзіць у цішы…

Будуць доўга храму сніцца
Дзве шчаслівыя душы.

***

Ва ўсім вінаваты я сам,
Цябе не віню я ніколі.
А наш гарадок — не Версаль,
Дзе можна душу супакоіць.

Я ціха пакіну твой лёс —
Спатканняў закончыўся баль.
І высахнуць шчокі ад слёз...
Ды толькі прычым тут Версаль?..

***

А ты вырасцеш прыгажуняй,
Па табе будуць хлопцы млець.
Будзе з танцаў чакаць матуля —
Праз фіранку у цемру глядзець.

А ты вырасцеш прыгажуняй,
Будуць хлопцы цябе цалаваць...
І сама потым станеш матуляй —
І не будзеш да раніцы спаць.

## Калізіі душы

***

Свет чытае Харукі Муракамі,
Ты чытаеш
Максіма Багдановіча.

***

Да цябе іду праз дождж,
Праз туман, снегапад і вецер...
Усё жыццё да цябе іду.

***

Ты праходзіш побач,
І нешта абрываецца ўнутры...
Месяц праходзіш побач, год, жыццё...

***

Падараваў табе кветкі,
Якія яшчэ не выраслі —
Няхай яны нагадваюць табе пра мяне.

***

Дождж стукае ў акно —
Просіцца ў твой дом...
Пад дажджом стаю я.

***

Ты жыла ў маім сэрцы,
Цяпер — пераехала ў іншае...
І не паклікала мяне на наваселле.

***

Чуеш, ідзе дождж?
Але ты яго не пачула
З-за дажджу.

***

Падае зорка на вачах маіх:
Не мая яна і не твая –
Адна на дваіх.

***

Шукай мяне,
Як вецер у полі…
Поле знайшоў.
І сілу ветру адчуў.
Але цябе так і не сустрэў.

***

Восень страсае лісце з дрэў,
Каб цёпла і мякка было зямлі...
Па якой ты ходзіш.

***

Вясна спяшаецца да нас,
Лета просіцца ў госці,
Восень ужо на парозе,
Зіма стукае ў дзверы…
Але ты ад’язджаеш.

***

Ноччу ў вёсцы цёмна,
Ты —

Мой ліхтарык.

***

У тваім акне — ноч,
У маім — вечар,
А ў чужых вокнах заўсёды дзень.

***

Я прысвяціў табе вершы,
А ты хацела салодкага віна,
Каб запіць маю горкую паэзію.

***

Знаёмыя словы з песні:
“За туманам нічога не бачна…”,
А я бачу толькі цябе.

***

Я люблю народныя песні,
А ты — сучасную паэзію…
Сёння нам спявалі салаўі.

***

Сэрца маё цісне. Хвалюецца...
Бо яно адчула тваю прысутнасць раней,
Чым я.

***

Не плач.
Не перажывай…
Я пакідаю цябе, каб вярнуцца.

***

У гэтым горадзе многа сонца —
У гэтым горадзе
Ты жывеш.

***

Я — матылёк,
Які заляцеў у твой пакой...
Ты адчыніла вакно
І выпусціла мяне на волю.

***

Першы раз ты мне паказала слуцкія паясы,
Першы раз ты мне праспявала “Зорку Венеру”…
І апошні раз у жыцці я бачыў цябе.

***

Я чытаю табе беларускія казкі,
Якія ты любіш слухаць.
Яны — пра нас.

***

Мы паедзем сёння да Адама Міцкевіча,
А заўтра завітаем да Сыракомлі…
Але спачатку пагасцюем у Янкі Купалы.

***

Калі гора на сэрцы —
Успамінаю радасць,
Калі радасць на сэрцы —
Варушу гора.
Бо сапраўды:

Якое ж гэта шчасце
Без гора і радасці,
Без радасці і гора?!

***

Упершыню ты ўзяла ў рукі серп
І пачала жаць жыта,
Праз якое вяла сцежка
Да цябе.

***

Памрэш ты —
Памру я,
Але ты, шчаслівая, жывеш,
Каб доўга жыў я.

***

Без цябе гэты горад чужы,
Без цябе я таксама чужы,
І сны мае без цябе чужыя.
І позіркі іншых —
Чужыя позіркі...
З'яўляешся ты —
Усё для мяне становіцца
Блізкім і дарагім,
Толькі я для цябе — чужы.

# Змест

Родныя словы
Камень
Малітва
Я выйшаў родам з гэтага народа...
Мова
Наваградскі кліча рог...
Мая залатая восень...
Міхал Валовіч
Касцёл святога Андрэя ў Слоніме
Паэт
Мая мова
Гальяш Леўчык
Успенскі сабор у Жыровічах
Купляюць Джэка Лондана...
У Вязынцы светлай і блізкай...
“Лён” Анатоля Сыса
Перачытваючы “У палескай глушы” Якуба Коласа
Таўры
Пытанне да Кузьмы Чорнага
Фальварак
Эмілія Плятэр
Велікодная субота
1938 год
Мне па начах мая Рагнеда сніцца...
Калі...
О, Беларусь — святая каралева...
Згадка пра 1794 год
Памяці паэта Сяргея Дарожнага

У хаце Ларысы Генію ш у Зэльве
Божа наш ідзе на Беларусь
Каханы край мой
Помнік Максіму Багдановічу ў Мінску
Васілю Быкаву
Тэатр у Слоніме
Змагарам за Беларусь
Парыж
Непрыкметная і пяшчотная…
Сынковічы
Думаў вершы Алесь Пісьмянкоў…
Перыферыя?
Маленства
Зорка
Актава
Шчара
Пчолка
Вербніца
Студня
Трыялет
Хлеб
Паеду ў вёску…
Крочу ў восень…
Неба казыча гром…
Першы снег
Манашка
Ва ўсім вінаваты я сам…
А ты вырасцеш прыгажуняй…
Калізіі душы

Літаратурна-мастацкае выданне
*Чыгрын Сяргей Мікалаевіч*
**Камень Міндоўга**
Вершы

Адказны за выпуск Генадзь Вінярскі
Рэдактар Алена Спрытніч
Камп'ютэрны набор Алены Ахрамейка
Вёрстка Яраслава Мальдзіса
Карэктар Алена Спрытніч

Памер 70х100 1/32
Наклад 100 асобнікаў